Ліманоўскі Глеб,
ДУА «Міёрская сярэдняя школа №2 імя М.Р. Ізварына»
6 «А» клас

Што такое адзінства? Здаецца, над такім пытаннем ва ўсе часы задумваўся кожны чалавек планеты Зямля.

Я, адзінаццігадовы хлопец, злавіў сябе на думцы, што для мяне адзінства – гэта ўзаемасувязь мінуўшчыны і будучыні, імкненне трымацца разам у любой сітуацыі, а таксама гэта чалавечнасць у зносінах паміж людзьмі.

Як нам добра вядома, без гісторыі не можа быць будучыні. І тое, наколькі мы памятаем і паважаем падзеі мінулага і ўчынкі людзей, бачым тагачасныя памылкі і робім вывады, залежыць наша мірная і шчаслівая будучыня.

Нездарма 17 верасня ў нашай краіне адзначаецца дзяржаўнае свята – Дзень народнага адзінства. Гэта дата была выбрана невыпадкова. Менавіта ў гэты дзень у 1939 годзе пачалося вызваленне Заходняй Беларусі ад польскай акупацыі. У нашым горадзе нават ёсць вуліца, названая ў гонар гэтай падзеі.

Мы, падрастаючае пакаленне, не павінны забываць, праз што давялося прайсці нашым продкам, каб зберагчы тое, што маем цяпер. Заўсёды павінны памятаць, цаной якіх неймаверных намаганняў мы сёння адзіныя, мы разам, мы адно цэлае.

Чырвонай ніткай праходзіць ідэя згуртаванасці, узаемадапамогі на працягу ўсіх перыядаў гісторыі.

Зазірнем у тыя часы, калі для вырашэння важных пытанняў збіралася веча. І зразумеем, што і тады людзі сумесна клапаціліся пра ўмовы, у якіх яны будуць жыць, пра асяроддзе, якое іх будзе акружаць. А гэта немалаважна. Бо ад гэтага залежалі шчасце і дабрабыт народа.

З энцыклапедый і гістарычнай літаратуры я ведаю, што беларускія землі ў розныя гістарычныя эпохі падвяргаліся нападу ворагаў. І не заўсёды хутка ўдавалася пазбегчы іншаземнага захопу. Тады людзям, якія жылі ў тыя часы, даводзілася вельмі цяжка. Бо парушана было адзінства, сувязь паміж людзьмі, не было магчымасці ў поўнай меры дапамагчы роднаму чалавеку, сябру, суседу.

Нягледзячы на ўсе выпрабаванні, цяжкасці, нашы продкі імкнуліся згуртавацца, аб’яднацца, праяўляючы пры гэтым мужнасць і гераізм, каб выстаяць, не зламіцца.

З упэўненасцю магу адзначыць, што сэнс слова адзінства давялося добра зразумець і майму прадзеду Уладзіміру. Ён расказваў майму тату, як беларусам жылося пры Польшчы, калі нашы землі былі расколаты на дзве часткі.

Карані майго прадзеда з вёскі Глінаўка Міёрскага раёна. На той момант яму было прыкладна столькі год, колькі мне зараз. Заняткі ў школах выкладаліся на польскай мове. Нават за дробныя правіннасці даводзілася стаяць у куце на гароху. Гэта было цяжкае пакаранне.

У той час назіраўся заняпад беларускай культуры, нацыянальных традыцый, родная мова была пад забаронай. У людзей не было магчымасці размаўляць па-беларуску, адзначаць разам святы, перадаваць нацыянальную культурную спадчыну нашчадкам.

Адзінства было адноўлена ў 1939 годзе, калі былі злучаны Заходняя і Усходняя Беларусь. Людзі нарэшце змаглі сустрэцца пасля вымушанага доўгага расстання. Я лічу, што вельмі важна кожнаму беларусу не забываць пра тое, што 17 верасня мы адзначаем 85-годдзе гэтай значнай для нашага народа падзеі.

Адзінства, узаемадапамога, згуртаванасць дапамаглі нашаму народу перамагчы ворага ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пачуццё адказнасці кожнага за ўсё і за ўсіх выратавала нашых прадзедаў і ў суровыя пасляваенныя гады. Без гэтага было б немагчымым аднаўленне разбураных гарадоў і вёсак на нашай зямлі. Дзякуючы сіле духа, адзінству народа пачалося будаўніцтва новых заводаў і фабрык, разбураная гаспадарка была поўнасцю адноўлена.

Урокі мінулага, цяжкі лёс і сумны вопыт нашых продкаў паказваюць, што, толькі аб’яднаўшыся, мы зможам выстаяць у любых умовах і не знікнуць як нацыя.

Для мяне гэта і ёсць адзінства.